| Накірункі развіцця дзяржавы | Дасягненні | Праблемы | Перспектывы (прагноз) |
|---|---|---|---|
| Сацыяльна-эканамічнае развіццё | - складванне сацыяльна-арыентаванай рыначнай сістэмы;<br>- стрыманая прыватызацыя, захаванне моцнага дзяржаўнага сектара эканомікі;<br>- устойлівы рост ВУП;<br>- рост прамысловай прадукцыі і прадукцыі с/г;<br>- захаванне і развіццё калгаснай і саўгаснай вытворчасці, стварэнне аграгарадкоў;<br>- рост экспарту;<br>- пошук шляхоў энергазамяшчэння і энергазберажэння;<br>- стварэнне новых навукаёмістых тэхналогій;<br>- высокія тэмпы жыллёвага будаўніцтва;<br>- павелічэнне колькасці інвестыцый. | - зніжэнне колькасці насельніцтва;<br>- захаванне элементаў цэнтралізаванага кіравання эканомікай;<br>- празмернае ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў у дзейнасць прадпрыемстваў прыватнага сектара эканомікі;<br>- няўстойлівы курс нацыянальнай валюты;<br>- дэвальвацыя;<br>- высокая інфляцыя;<br>- залежнасць эканомікі ад замежных крэдытаў;<br>- невысокая рэнтабельнасць прамысловай і с/г прадукцыі;<br>- залежнасць эканомікі ад імпарту энергарэсурсаў;<br>- празмерная залежнасць эканомікі ад экспарту ў Расію;<br>- адмоўнае сальда знешняга гандлю. | - устойлівы рост насельніцтва;<br>- прыватызацыя буйных дзяржаўных прадпрыемстваў;<br>- развіццё прыватнага сектара эканомікі, падтрымка дзяржавай малога бізнесу і прадпрымальніцтва;<br>- стабільны курс нацыянальнай валюты (магчыма увядзенне расійскага рубля);<br>- інфляцыя 5-10% у год;<br>- рост замежных інвестыцый;<br>- зніжэнне залежнасці эканомікі ад імпарту энергарэсурсаў (пабудова АЭС);<br>- стабільнае станоўчае сальда знешняга гандлю. |
| Грамадска-палітычнае развіццё | - набыццё рэальнага суверэнітэту;<br>- распрацоўка і прыняцце Канстытуцыі;<br>- фарміраванне дэмакратычнай шматпартыйнай палітычнай сістэмы;<br>- складванне моцнай сістэмы дзяржаўнай улады;<br>- правядзенне рэферэндумаў па асабліва важным пытанням грамадска-палітычнага жыцця;<br>- актыўны ўдзел грамадзян у выбарах і рэферэндумах;<br>- стабільнасць грамадска-палітычнага жыцця;<br>- міжнацыянальная і міжканфесійная стабільнасць;<br>- пошук нацыянальнай ідэі, пачатак складвання ідэалогіі беларускай дзяржавы. | - слабасць палітычных партый;<br>- адсутнасць аб’ядноўваючай нацыянальнай ідэі;<br>- нізкая эфектыўнасць мясцовых Саветаў дэпутатаў;<br>- перавага органаў выканаўчай галіны ўлады над заканадаўчай;<br>- адсутнасць канструктыўнага дыялогу паміж апазіцыяй і органамі дзяржаўнай улады. | - канчатковае афармленне нацыянальнай ідэі, прыняцце яе большай часткай грамадства;<br>- узмацненне ролі і ўплыву палітычных партый і грамадскіх рухаў;<br>- абуджэнне грамадскай актыўнасці і ініцыятыўнасці на месцах, павышэнне ролі мясцовых выбарных органаў улады;<br>- дзейнасць апазіцыі ў інтарэсах дзяржавы і народа. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Знешне-палітычнае развіццё | - прызнанне сусветным грамадствам РБ, як незалежнай дзяржавы;<br>- самастойны курс знешняй палітыкі РБ;<br>- актыўны ўдзел у рабоце міжнародных арганізацый;<br>- адмова ад ядзернай зброі;<br>- імкненне да статусу нейтральнай дзяржавы;<br>- шматвектарнасць знешнепалітычнага курсу;<br>- умацаванне сувязей Беларусі з краінамі СНД;<br>- інтэграцыя з Расіяй, стварэнне Саюзнай дзяржавы;<br>- стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі (АДКБ);<br>- эканамічная інтэграцыя ў межах еўраазійскай прасторы (ЕўраАзЭС, Мытны саюз, Адзіная эканамічная прастора) | - празмерная арыентацыя ў знешняй палітыцы на Расію;<br>- адсутнасць рознабаковых паўнавартасных адносін з краінамі Еўрасаюза і ЗША;<br>- эканамічныя і дыпламатычныя санкцыі ў дачыненні да Беларусі з боку ЗША і краін Еўрасаюза;<br>- наяўнасць візавага рэжыму з суседзеямі Беларусі – Польшчай, Літвой, Латвіяй. | - прызнанне Беларусі нейтральнай дзяржавай;<br>- наладжванне нармальных рознабаковых адносін з краінамі Еўрасаюза і ЗША;<br>- спрашчэнне візавага рэжыму (бязвізавы рэжым) з бліжэйшымі суседзямі. |
| Развіццё ў галіне культуры, адукацыі, навукі і спорту | - складванне спрыяльных умоў для развіцця культуры;<br>- роўны статус беларускай і рускай моў;<br>- складванне нацыянальнай сістэмы адукацыі;<br>- развіццё інфармацыйных тэхналогій;<br>- стварэнне Парка высокіх тэхналогій;<br>- паспяховае развіццё беларускай медыцыны;<br>- пошук новых шляхоў у адлюстраванні рэчаіснасці ў літаратуры і мастацтве;<br>- высокі ўзровень беларускай оперы і балета;<br>- рэгулярнае правядзенне вядомых музычных і кінафестываляў;<br>- захаванне гістарычных помнікаў;<br>- будаўніцтва масавых спартыўных аб’ектаў;<br>- высокія дасягненні беларускіх спартсменаў. | - памяншэнне ролі беларускай мовы;<br>- непаслядоўныя рэформы ў сістэме адукацыі;<br>- недастатковая якасць адукацыі на розных узроўнях;<br>- недалучэнне РБ да Балонскага працэсу;<br>- адарванасць навукі ад практыкі, яе невысокая эфектыўнасць;<br>- зніжэнне цікавасці да сучаснай беларускай літаратуры, мастацтва з боку народа;<br>- адсутнасць масавага фізкультурна-спартыўнага руху;<br>- заняпад дзіцяча-юнацкага спорту. | - завяршаюцца рэфармацыяйныя пераўтварэнні ў сістэме адукацыі;<br>- Беларусь далучаецца да Балонскага працэсу;<br>- паўсюднае распаўсюджанне інфармацыйных тэхналогій;<br>- навука ператвараецца ў сапраўдную вытворчую сілу;<br>- літаратура і мастацтва адлюстроўваюць вострыя праблемы сёняшняга дня, блізкія і зразумелыя людзям;<br>- фізультура і спорт, здаровы лад жыцця становяцца масавымі з’явамі. |